**«ГУ́ТАРКА ПА́НА З ХЛО́ПАМ»**, ананімны вершаваны твор бел. л-ры 19 ст. Пабудаваны ў форме дыялога «яснага пана» з селянінам Сцяпанам. Мае выразны антыпрыгонніцкі змест. Пан выступае тыранам, які патрабуе ад паміраючага «хлопа» даслаць на працу («сушыць», «грабіць») жонку Дароту. Маўленне прыгнятальніка насычана паланізмамі («не прыходзе до мне на работу», «пянёндзы»), што адлюстроўвае яго сац. і нац. варожасць у дачыненні да бел. мужыка. Адказ селяніна споўнены пратэсту і перасцярогі: «Ужо панскі хлеб дакучыў, // Як пан нас добра мучыў». Пра сац. згоду, якую прапагандавалі лібералы, у т.л. У.Сыракомля («Добрыя весці») і В.Дунін-Марцінкевіч («Ідылія»), у бел. гутарцы не згадваецца. Наадварот, гал. герой гучна заяўляе пра мінулыя крыўды («Добра паны гандлявалі — // Слугі на сабак мянялі»). У словах селяніна моцнае патрабаванне справядлівай помсты. Гэтым гутарка набліжаецца да 2-й ч. «Дзядоў» А.Міцкевіча, у якой сяляне таксама каталі жорсткага прыгонніка. Вырашэнне канфлікту паміж панам і «хлопам», выключна негатыўны вобраз землеўласніка дазваляюць меркаваць, што гутарка была створана напярэдадні паўстання 1863—64.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова